# У госці да кніг



## Асветніцкі праект

**Юбілей кнігадрукавання, што адзначаецца ў гэтым годзе, становіцца нагодай шматлікіх мерапрыемстваў па папулярызацыі багатай кніжнай спадчыны беларускай культуры. Для супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі гэта значная падзея стала штуршком да стварэння і рэалізацыі культурна-асветніцкага праекта "У госці да кніг". Аб тым, як вядзецца работа са школьнікамі ў межах праекта, аб магчымасцях супрацоўніцтва з установамі адукацыі расказвае загадчыца сектара навукова-праектнай работы НББ Таццяна Андрэеўна САПЕГА.**



Праект рэалізуецца сродкамі культурна-асветніцкіх заняткаў у Музеі кнігі Нацыянальная бібліятэкі і накіраваны на развіццё цікавасці да кнігі і чытання, фарміраванне гонару за дасягненні і багатыя традыцыі айчыннай кніжнай культуры.

З самага пачатку стваральнікі праекта паставілі перад сабой пытанне: што зрабіць, каб прапанаваныя дзецям заняткі сталі сапраўды цікавымі і запатрабаванымі? Адказ знайшлі ў распрацоўцы методыкі арганізацыі музейных заняткаў на аснове вывучэння навуковых даследаванняў, практычнага вопыту беларускіх і замежных бібліятэк і музеяў. Сучасныя даследаванні звязваюць інавацыі ў адукацыі з актыўнымі і інтэрактыўнымі метадамі навучання, якія патрабуюць дыялогавай камунікацыі, творчага падыходу і спрыяюць больш эфектыўнаму пазнанню аб'екта. Наватарства праекта "У госці да кніг" заключаецца ў выпрацоўцы метадаў пазнання кніжнай спадчыны, якія дазваляюць дзецям быць не проста слухачамі, што ўспрымаюць інфармацыю, назіральнікамі, што глядзяць на экспанаты, а найперш актыўнымі ўдзельнікамі працэсу. Пры гэтым мяняецца і роля дарослых, дзейнасць якіх накіроўваецца ў першую чар-







гу на стварэнне ўмоў для праяўлення дзіцячай ініцыятывы [1; 2]. Выкарыстанне інтэрактыўных метадаў патрабуе ад спецыяліста не толькі прафесіяналізма ў сваёй галіне, але і гатоўнасці да творчай дзейнасці, выхаду за рамкі звыклага і стэрэатыпнага.

На сённяшні дзень праект "У госці да кніг" уключае **4 серыі заняткаў**:

1) "Клуб кніжных прафесараў";
2) "Урокі ў музеі";
3) "Музейныя чытанні";
4) "Тайны праваслаўнай кнігі".

**"Клуб кніжных прафесараў"** уяўляе цэласны курс з 9 заняткаў і прадугледжвае сістэматычныя кантакты з канкрэтнай аўдыторыяй. Фарміраванне гэтай аўдыторыі адбывалася двумя шляхамі: кантактаванне са школамі і стварэнне зборных груп. Другі шлях, безумоўна, быў больш складаным, але ён даў магчымасць убачыць узровень зацікаўленасці дзяцей і іх бацькоў нашай тэматыкай ва ўмовах наяўнасці ў сталіцы вялікай колькасці адукацыйных паслуг. У выніку актуальнасць і запатрабаванасць праекта былі пацверджаны — сфарміраваліся дзве групы, якія штомесяц наведваюць заняткі ў Музеі кнігі. Атрыманню ведаў спрыяюць незвычайная музейная атмасфера, сяброўскія ўзаемаадносіны, дзе кожнае дзіця выяўляе сябе свабодна, але ў той жа час усе захопленыя агульнай справай.

**"Урокі ў музеі"** арыентаваныя на супрацоўніцтва са школамі. Тэматыка заняткаў распрацавана на падставе школьнай праграмы і прадугледжвае сувязь навучальнай і выхаваўчай дзейнасці на базе бібліятэкі. У 2016 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь серыя была ўключана ў змест "Метадычных рэкамендацый па правядзенні ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі 1 верасня першага ўрока і мерапрыемстваў, прысвечаных Дню ведаў і Дню беларускага пісьменства" [3].

**"Музейныя чытанні"** маюць на мэце адраджэнне традыцыі чытання ўслых. Яны імкнуцца зрабіць чытанне папулярным заняткам сярод дзяцей і моладзі і прадэманстраваць, што бібліятэка можа стаць месцам захапляльнага пагружэння ў свет той ці іншай кнігі з дапамогай інтэрактыўных метадаў.

Серыя **"Тайны праваслаўнай кнігі"** расказвае пра гісторыю і традыцыі праваслаўнай рукапіснай і друкаванай кнігі, дапамагае праз кнігу засваенню праваслаўнай культуры. Заняткі прызначаюцца пераважна для вучняў нядзельных школ.

"Зазірнём" на некалькі хвілін на музейныя заняткі, каб зразумець методыку іх правядзення і адчуць атмасферу. Дзеці бачаць арыгіналы кніг у экспазіцыі, што ўжо само па сабе іх уражвае, і нават становяцца музейнымі экскурсаводамі і даследчыкамі. Так, яны не толькі даведваюцца пра магчымыя формы кніг і матэрыялы, з якіх іх выраблялі, але і пантамімай паказваюць, напрыклад, дрэва, з лісця якога ствараліся індыйскія кнігі-потхі; не толькі даведваюцца пра рукапісную культуру, але і спрабуюць сябе ў якасці перапісчыкаў, ствараюць свае ўнікальныя ініцыялы; не толькі знаёмяцца з адрозненнямі еўрапейскай паперы ад усходняй, але і самі выяўляюць філіграні; не толькі ўзбагачаюць свае веды пра жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны, але і ствараюць дызайнерскія партрэты першадрукара, складваюць скарынаўскі тытульны аркуш з пазлаў і інш.



Метад абмеркавання дазваляе ўдзельнікам групы выказацца па тэме, пачуць розныя меркаванні і аргументы, каб затым самастойна зрабіць аналіз і высновы. Падчас заняткаў серыі "Музейныя чытанні" дзеці абмяркоўваюць важныя пытанні: што лепш — купіць кнігу альбо торт; што больш карысна — кніга, камп'ютар альбо тэлевізар і інш. Погляды, вядома, розняцца, дзеці выказваюцца пра карыснасць і шкоднасць некаторых з прапанаваных прадметаў. Але кніга заўсёды перамагае, яе карысць прызнаецца большасцю дзяцей і абгрунтавана даказваецца.

Творчыя заданні дазваляюць школьнікам праявіць індывідуальныя здольнасці, замацаваць атрыманыя веды і творча паглядзець на аб'ект пазнання. Так, з кардону і палачак для марожанага дзеці сваімі рукамі робяць "бамбукавыя скруткі", пасля знаёмства з гісторыяй мініяцюрнай кнігі працуюць над самастойным яе стварэннем.

Інтэрактыўнае навучанне дае магчымасць якасна змяніць узаемадзеянне, зрабіць яго прывабным для групы. Пры гэтым варта не забываць, што выкарыстанне такіх прыёмаў з'яўляецца не самамэтай, а толькі сродкам рашэння пастаўленых асветніцкіх задач, стварэння атмасферы творчага ўзаемадзеяння, фарміравання пазітыўных адносін да прапанаванай тэматыкі.




Праект "У госці да кніг" з'яўляецца актуальным, унікальным і сацыяльна запатрабаваным. Супрацоўніцтва са школамі, улік пажаданняў педагогаў сталі падставай да распрацоўкі яшчэ аднаго асветніцкага прадукту для вучняў I—XI класаў — **экспрэс-курсу "Ад кнігі рукапіснай — да друкаванай"**. Гэты курс складаецца ўсяго з трох музейных заняткаў, але дае базавы ўзровень разумення асноўных этапаў развіцця кнігі, дазваляе дзецям убачыць кніжныя помнікі — артэфакты з мінулага, якім ужо 500 і больш гадоў. Пазнанне разнастайнасці кніжнай культуры адбываецца зноў жа праз дыялог, гульні і творчасць і рэалізуецца шляхам знаёмства з трыма тэматычнымі блокамі:

1) "Рукапісная кніга — падмурак для стварэння кнігадрукавання";
2) "Ёган Гутэнберг і пачатак еўрапейскага кнігадрукавання";
3) "Францыск Скарына — беларускі першадрукар".





На працягу 2016 г. Нацыянальная бібліятэка Беларусі актыўна ўдзельнічала ў значных рэспубліканскіх мерапрыемствах, прысвечаных папулярызацыі кніжнай культуры, сярод якіх — Нацыянальны дзіцяча-маладзёжны форум "Скарынаўскія дні ў Полацку", Дні беларускага пісьменства ў Рагачове, дзе для юных чытачоў праводзілася цікавая асветніцкая праграма "Пазітыў ад Скарыны".

Юбілейны, 2017 год будзе яшчэ больш багатым на разнастайныя мерапрыемствы, сустрэчы, культурныя праграмы. Пазнаёміцца з імі можна на партале НББ www.nlb.by. Чакаем усіх у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі!





**ЛІТАРАТУРА**


1. Багнюк, И. В. Интерактивные методы и формы социально-педагогической работы с учащимися : методические рекомендации / И. В. Багнюк, А. П. Безрукова. — 5-е изд., стереотипное. — Минск : Республиканский институт профессионального образования, 2015. — 60 с.
2. Кашлев, С. С. Интерактивные методы обучения : учебно-методическое пособие / С. С. Кашлев. — 2-е изд. — Минск : ТетраСистемс, 2013. — 222 с.
3. Метадычныя рэкамендацыі па правядзенні ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі 1 верасня першага ўрока і мерапрыемстваў, прысвечаных Дню ведаў і Дню беларускага пісьменства // Настаўніцкая газета. — 2 жніўня 2016. — С. 6—7.